View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

УДК 94(476) + 37.035.6

# УВЕКАВЕЧАННЕ ПАМЯЦІ ЗАГІНУЎШЫХ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ ЯК АДНА З ФОРМАЎ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ СУЧАСНАЙ МОЛАДЗІ

***Сяргей Ятусевіч***
*Пінск, Беларусь*

Анатацыя: Раскрываюцца пытанні ўвекавечання памяці загінуўшых абаронцаў Айчыны як адной з формаў грамадзянска-патрыятычнага выхавання сучаснай моладзі

***Ключавыя словы: увекавечанне памяці загінуўшых абаронцаў Айчыны; грамадзянска-патрыятычнае выхаванне; воінскія захаванні; сучасная моладзь; воінскі абавязак; пошукавы рух (пошукавая работа, пошукавая дзейнасць)***

Памяць пра Вялікую Айчынную вайну з'яўляецца неад'емнай часткай калектыўнай памяці беларускага грамадства, што абумоўлена значнасцю дадзенага перыяду ў гісторыі Беларусі. З аднаго боку, гэта падзея вызначыла будучыню беларускай дзяржавы, з другога – пакінула глыбокі трагічны след у жыцці кожнай сям'і. Людскія страты ў гады вайны склалі 2596676 чалавек, у тым ліку загінуўшых вайскоўцаў у баях 332569 чалавек, у лагерах ваеннапалонных – 810691, партызан і падпольшчыкаў – 44791, мірнага насельніцтва – 1409225 чалавек [2, с. 67] .

Цяжкую памяць пакінула нам пра сябе Вялікая Айчынная вайна, пасляваенная разруха. Памяць аб загінуўшых захоўвалася ў сэрцах іх родных і блізкіх. Не ўсе маглі паехаць пакланіцца сваім блізкім на іх магілах, але кожны хацеў, каб у яго горадзе, вёсцы было месца, куды ён мог бы прынесці кветкі, адагрэцца душой і сэрцам. Каб увекавечыць гэтую памяць, па ўсёй краіне сталі ўзводзіцца помнікі загінуўшым салдатам.

Работа па мемарыялізацыі трагічных і гераічных старонак Вялікай Айчыннай вайны з'яўляецца часткай дзяржаўнай палітыкі, накіраванай, перш за ўсё, на адлюстраванне гераічнага боку вайны, урачыстасці Перамогі, дружбы паміж народамі. Значную ўвага праблеме ўвекавечання надае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка. Выступаючы 29 красавіка 2005 года на цырымоніі адкрыцця памятнага знака «Беларусь партызанская», Прэзідэнт адзначыў, што «мы пастаянна памятаем аб подзвігу тых, хто сваёй доблесцю і гераізмам, сваёй крывёю абараніў наша права сва-

Полесгу

бодна жыць і працаваць». Кіраўнік дзяржавы таксама падкрэсліў, што Беларусь, як ні адна іншая краіна, вельмі пачціва і з павагай ставіцца да сваіх герояў. «Мы зрабілі і зробім столькі, колькі не робіць ні адна дзяржава ў свеце, каб нашы дзеці і ўнукі памяталі пра Вас, герояў-пераможцаў», – сказаў А.Г. Лукашэнка [6].

Памяць аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны ўвасоблена ў розных формах ў літаратуры, кінематографе, музычных творах, выяўленчым мастацтве, музеях і тэматычных экспазіцыях. Імёны герояў Вялікай Айчыннай вайны прысвойваюцца населеным пунктам, вуліцам і плошчам, прадпрыемствам, арганізацыям, навучальным установам, воінскім часцям. Асаблівая роля ў працэсе ўвекавечання належыць помнікам і манументам, якія з'яўляюцца асноўнай формай матэрыяльнага ўвасаблення памяці пра Вялікую Айчынную вайну.

Помнікі не толькі даніна павагі і памяці народа сваім героям, гэта яшчэ невычэрпная крыніца патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення.

Моладзь ва ўсе часы несла і нясе асаблівую адказнасць за захаванне і працяг традыцый грамадства, за пераемнасць яго гісторыі і культуры, за будучыню сваёй краіны. Ад таго, якімі прыярытэтамі ў сістэме каштоўнасных арыентацый будуць кіравацца маладыя людзі, шмат у чым будуць вызначацца тэмпы сацыяльнага і эканамічнага развіцця рэспублікі, яе дабрабыт. Асноўная задача дзяржаўнай палітыкі ў галіне выхавання вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка: «Выхаваць грамадзяніна-патрыёта, адухоўленага ідэаламі дабра і сацыяльнай справядлівасці, здольнага тварыць і будаваць у імя Айчыны» [1].

На жаль, ужо шмат згублена, далёка не на першым месцы ў некаторай часткі нашай моладзі на шкале духоўных каштоўнасцей апынуўся патрыятызм, адбываецца падмена гэтых духоўных каштоўнасцей і арыенціраў жыцця. Але менавіта гераічныя і трагічныя падзеі пераможнай вайны з'яўляюцца той асновай, на якой доўгі час будуць апрабоўвацца нашы нацыянальныя ідэі, фарміравацца ідэалогія беларускай дзяржавы.

Састаўной часткай патрыятычнага выхавання моладзі з'яўляецца ўвекавечанне памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны. Менавіта гэта напаўняе канкрэтным зместам ідэалагічную працу ва ўстановах адукацыі, далучае юнакоў і дзяўчат да вялікага гераічнага і трагічнага мінулага нашай краіны, развівае і выхоўвае ў іх пачуццё гонару за наш вялікі народ, гістарычную адказнасць за лёсы Радзімы.



ПолесГУ

Значнае месца ў ажыццяўленні палітыкі ўвекавечвання адводзілася Беларускаму добраахвотнаму таварыству аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускаму рэспубліканскаму савету прафсаюзаў, ветэранскім, камсамольскім і піянерскім арганізацыям БССР. Грамадскія арганізацыі прымалі ўдзел у вывучэнні, выяўленні, уліку воінскіх помнікаў, збудаванні абеліскаў, мемарыяльных дошак, закладцы мемарыяльных сквераў, алей, паркаў, стварэнні школьных музеяў, куткоў, ваенна-патрыятычных клубаў, арганізацыі шэфскай работы над помнікамі, доглядзе і добраўпарадкаванні месцаў пахаванняў загінуўшых у гады вайны, пошукава-даследчай дзейнасці [4, с. 105].

Сёння пошукавы рух – гэта адна з самых эфектыўных формаў ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі, якая з'яўляецца процідзеяннем ідэалогіі нефашызму, нацыяналізму і многім іншым негатыўным з'явам у сучасным грамадстве. Пошукавая праца спрыяе не толькі ваенна-патрыятычнаму, але і інтэрнацыянальнаму выхаванню моладзі.

Ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь створаны 52-гі асобны спецыялізаваны пошукавы батальён (адзіны ў свеце), які за час свайго існавання выявіў і перапахаваў па ўсіх правілах воінскага рытуалу астанкі 11 608 безыменных герояў, у 197 сем'яў вярнуў імёны без вестак зніклых воінаў Вялікай Айчыннай вайны [3].

Маладое пакаленне на канкрэтных прыкладах пераконваецца, што на франтах вайны разам змагаліся прадстаўнікі ўсіх народаў нашай краіны. У працэсе архіўна-пошукавай работы даследчыкі знаходзяць канкрэтныя факты, якія сведчаць аб вызваленні савецкімі салдатамі краін Еўропы ад фашызму, аб байцах інтэрнацыянальных брыгад. У ходзе пошукавых экспедыцый моладзь дакранаецца да подзвігу тых, хто аддаў сваё жыццё дзеля жыцця іншых.

В.А. Сухамлінскі вучыў, што не трэба баяцца, што маладое пакаленне дакранецца да гора чужога чалавека. Такі дотык выклікае жаданне дапамагаць людзям, а таксама пачуццё адказнасці за іх лёсы [5, с. 38]. Гэты саўдзел і надае пошукавай працы выхаваўчае значэнне – вучыць іх суперажываць, спачуваць, дапамагае лепш даведацца праўду аб вайне, глыбей адчуць подзвіг народа і шчасце жыць пад мірным небам над галавой, выклікае пачуццё гонару за свой народ. Вядома, што Радзіма, як і маці, у чалавека адна, і абавязак сына ў адносінах да яе свяшчэнны. Такім чынам, кожны малады чалавек павінен не толькі любіць сваю Радзіму, але і свядома фарміраваць гатоўнасць і здольнасць абараняць яе. Таму пошукавая праца, прапаганда

ПолесГУ

ратных традыцый нашага народа павінны спалучацца з практычнай падрыхтоўкай моладзі да вайсковай службы, з фарміраваннем у яе якасцяў, неабходных абаронцу Радзімы.

Умоўна можна вылучыць дзве групы грамадскіх пошукавых арганізацый. Да першай адносяцца аб'яднанні, якія базіруюцца на лепшых традыцыях савецкага пошукавага руху і ўлічваюць маральна-этычныя прынцыпы ў практычнай працы. Да ліку такіх варта аднесці Беларускую рэспубліканскую асацыяцыю «Пошук», зарэгісраваную Міністэрствам юстыцыі 14 сакавіка 1995 года, ваенна-патрыятычны клуб «Пошук», адкрыты ў 1983 годзе на базе ПТВ №19 г. Віцебска, клуб «Виккру», адкрыты на базе пошукавага атрада пры Магілёўскім цэнтры турызму, краязнаўства і экскурсій і інш. [4, с.130].

Аднаўляючы хроніку трагічных і гераічных старонак Вялікай Айчыннай вайны, члены пошукавых атрадаў адкрываюць новыя факты мужнасці і гераізму ўдзельнікаў вайны. Толькі за перыяд Вахты Памяці – 2009 членамі пошукавых атрадаў і клубаў, якія дзейнічаюць ва ўсіх раёнах Беларусі, знойдзена каля ста невядомых пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны, устаноўлены тысячы раней невядомых прозвішчаў загінуўшых [4, с. 87].

Да другой групы грамадскіх пошукавых аб'яднанняў адносяцца неаднародныя па складзе арганізацыі, фактычнай мэтай якіх з'яўляецца пошук каштоўных прадметаў, тэхнікі і зброі перыяду вайны. В.У. Шумскі справядліва адзначыў, што гэта «наспех сформированные, использующие статус патриотического объединения в качестве ширмы для иных целей, своей деятельностью просто дискредитирующие благородную цель поискового движения» [4 с. 87]. Такія неафіцыйныя пошукавыя атрады, якія спецыялізуюцца пераважна на артэфактах Вялікай Айчыннай вайны, адносяць да катэгорыі так званых «чорных капальнікаў». Асноўным матывам дзейнасці падобных груп і асобных грамадзян з'яўляецца карысьць.

У многіх установах адукацыі Рэспублікі Беларусь наладжана работа пошукавых атрадаў. Тут не шукаюць занядбалыя пахаванні; дзейнасць накіравана на пошук гістарычных звестак пра родны край, складанне гісторыі роднага горада, роднай вёскі, напісанне сачыненняў, рэфератаў, складанне фотадакументаў, летапісаў і да т.п.

Такім чынам, пошукавая работа павінна стаць неад'емнай часткай грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі. У ходзе яе маладое пакаленне спазнае гісторыю роднага краю, баявыя подзвігі беларускага народа;

наведваюць месцы былых бітваў; збіраюць звесткі аб сваіх земляках, якія праславіліся, абараняючы Радзіму; удзельнічаюць у пахаванні астанкаў загінуўшых воінаў; збіраюць матэрыялы пра вайскоўцаў, якія апынуліся ў палоне, зніклых без вестак; папаўняюць экспазіцыі сваіх музеяў. З гэтай мэтай ствараюцца экспедыцыйныя групы з вучняў на чале з педагогамі, ветэранамі, прадстаўнікамі вайсковых часцей, бацькамі; арганізуецца дзейнасць патрыятычных клубаў і гурткоў «Пошук», «Патрыёт», «Следапыт», пошукава-даследчых атрадаў; удзельнічаюць у турыстычных злётах «Дарогамі славы бацькоў».

Кожны навучэнец павінен наведаць святыя для беларусаў месцы: Брэсцкую крэпасць-герой, Буйніцкае поле, мемарыяльныя комплексы «Прарыў», «Хатынь», гісторыка-культурны цэнтр «Лінія Сталіна», прайсці па шляху воінскіх часцей, партызанскіх злучэнняў, якія змагаліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі. Турысцка-краязнаўчыя маршруты могуць пралягаць сцежкамі Белавежскай пушчы, праз Бярэзінскі і Прыпяцкі запаведнікі, Свіцязянскі заказнік, Налібоцкую пушчу і інш.

У наш час асаблівую ўвагу рабоце па ахове воінскіх мемарыяльных аб'ектаў надаюць ўстановы адукацыі Брэстчыны. Рашэннямі гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў за ўстановамі адукацыі замацаваны больш за 1200 помнікаў, абеліскаў, мемарыялаў, месцаў пахаванняў. Сумесна з грамадскімі аб'яднаннямі «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя» і «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», ветэранскімі арганізацыямі, ваенкаматамі прыводзяць у парадак памятныя месцы [4, с. 90].

Асаблівае значэнне ў працы па грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню моладзі адводзіцца музеям баявой славы, у якіх сабраны матэрыялы пра ветэранаў вайны, сведкаў ваенных гадоў, воінскія злучэнні і часці, якія ўдзельнічалі ў вызваленні нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, партызанаў і падпольшчыкаў, якія арганізавалі супраціўленне на часова акупіраванай тэрыторыі. Менавіта ў іх прадстаўлены гераічныя прыклады абароны сваёй Радзімы, гатоўнасці ахвяраваць дзеля яе жыццём, што спрыяе фарміраванню патрыятычных вобразаў і ўяўленняў навучэнцаў.

Гераічны перыяд у жыцці краіны, народа, жывая сувязь пакаленняў дазваляюць дзецям па-новаму зірнуць на гісторыю Радзімы, дакрануцца да вытокаў яе нацыянальнага гонару, дапамагаюць фарміраваць у іх ўласную грамадзянскую пазіцыю. Частка экспазіцый у музеях прысвечана лістам, дакументам даваенных і ваенных гадоў. Дзякуючы перапісцы, успамінам



Полесгу

відавочцаў вайны і іх сваякоў вядомы гераічныя лёсы многіх падпольшчыкаў і франтавікоў. Падрыхтоўка навучэнцамі спектакляў на аснове сабраных матэрыялаў дазваляе ажыццявіць кампазіцыйнае ўвасабленне ваенных гадоў, узнавіць унікальныя падзеі з жыцця ўдзельнікаў вайны.

Велізарнае выхаваўчае ўздзеянне на навучэнцаў аказвае праца па афармленні экспазіцый музеяў, прапаганда іх фондаў, сустрэчы з удзельнікамі падзей, падрыхтоўка навучэнцаў-экскурсаводаў. У музеях арганізуюцца тэматычныя выставы, прымеркаваныя да найбольш значных падзей часоў Вялікай Айчыннай вайны. Значны выхаваўчы эфект дае супрацоўніцтва музеяў баявой славы ўстаноў адукацыі з дзяржаўным музеем Вялікай Айчыннай вайны. Эфектыўнасцю адрозніваюцца такія формы музейнай педагогікі, як арганізацыя паходаў, экскурсій і пошукавых экспедыцый з мэтай папаўнення фонду музея; правядзенне тэматычных выстаў; канферэнцый па грамадзянска-патрыятычнай тэматыцы; сустрэчы з ветэранамі вайны і працы; праца атрада "Міласэрнасць", які аказвае дапамогу ветэранам вайны і працы.

У большасці ўстаноў адукацыі рэспублікі ёсць банкі даных аб ветэранах вайны, працы, інвалідаў і састарэлых грамадзянах, сем'ях загінуўшых воінаў, якія маюць патрэбу ў дапамозе. Асаблівая ўвага надаецца развіццю валанцёрскага руху навучэнцаў, правядзенню дабрачынных і працоўных акцый (акцыі "Дом без адзіноты", "Клопат», «Ветэран жыве побач"), накіраваных на канкрэтную дапамогу адзінокім людзям, інвалідам, сем'ям, якія пацярпелі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Атрады міласэрнасці аказваюць дапамогу ветэранам вайны і працы ў нарыхтоўцы дроў, апрацоўцы прысядзібных тэрыторый, уборцы кватэр, закупцы гародніны на зімовы перыяд, аказваюць дапамогу ў вядзенні гаспадаркі [1].

Ветэранаў вайны з кожным годам становіцца ўсё менш. У мэтах увекавечання і прапаганды гераічных подзвігаў беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ўстановы адукацыі мэтазгодна праводзіць працу над стварэннем фанатэк, зборнікаў успамінаў ветэранаў і іх блізкіх. Такую працу мэтазгодна праводзіць з удзелам членаў першаснай арганізацыі БРСМ, у рамках дзейнасці ваенна-патрыятычных клубаў, гурткоў, музеяў баявой славы. Такая праца дае магчымасць яшчэ раз падкрэсліць шчырую павагу вучнёўскай моладзі да баявых і працоўных заслуг ветэранаў. Гэта своеасаблівы помнік людзям, якія прайшлі цяжкімі і доўгімі дарогамі вайны.

Такім чынам, увекавечанне памяці загінуўшых абаронцаў айчыны з'яўляецца адной з формаў грамадзянска-патрыятычнага выхавання су-

Полесгу

часнай моладзі, з дапамогай якога адбываецца далучэнне юнакоў і дзяўчат да вялікага гераічнага і трагічнага мінулага нашай краіны, развіццё ў моладзі пачуцця гонару за наш вялікі народ, гістарычнай адказнасці за лёс Радзімы.

Памяць патрэбна не мёртвым, памяць патрэбна жывым, каб засцерагчыся ад кары бяспамяцтва і памятаць гераічныя традыцыі мінулага. Нельга забываць, што незалежнасць Беларусі кавалася ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Калі б не было разгрому нямецкага фашызму, не было б і суверэннай Рэспублікі Беларусь.


1. Методические рекомендации по совершенствованию гражданско-патриотического воспитания учащихся в период празднования 65-й годовщины освобождения Беларуси от немецко-фашистских захватчиков и Победы советского народа в Великой Отечественной войне / Официальный сайт Республиканского института профессионального образования [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ripo.unibel.by/vlp/10/print.php?art=1. – Дата доступа : 16.09.2016.

2. Памяць Беларусі, 1941–1945 : рэсп. кн. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2005. – 589 с.

3. Патриотическое воспитание, Официальный сайт Белорусского государственного университета физической культуры [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.sportedu.by/patrioticheskoe-vospitanie. – Дата доступа: 18.09.2016.

4. Савчук, Т.П. Увековечение событий Великой Отечественной войны в Беларуси: монография / Т.П. Савчук; науч.ред. В.В. Зданович; Брест.гос.ун-т имени А.С. Пушкина. – Брест: БрГУ, 2013. – 168 с.

5. Сухомлинский В.А. Как воспитать настоящего человека: (Этика коммунистического воспитания). Педагогическое наследие / Сост. О.В. Сухомлинская – М.: Педагогика 1990. – 288 с.

6. Трагедия Великой Отечественной не должна повториться, 29.04.2005 / Официальный интернет-портал Президента Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – 2001–2010. – Режим доступа: http://www.president.gov.by/press19306.html. – Дата доступа : 18.09.2016.


Полесгу